**Аляксеева, М.** Салдацкія сны / М. Аляксеева // Ленінская іскра (Сянно). — 1989. — 9 мая. — С. 2.

**САЛДАЦКІЯ СНЫ**



Неаднойчы па начах бачыць Віктар Сухадолаў у трывожных ранішніх снах горы і неба Афганістана, сваіх сяброў-аднапалчан, цяжкія баі. Пасля іх прачынаецца, не адразу ўсвядоміўшы, дзе ён. Такое не забываецца, як той памятны бой, пасля якога на грудзях салдата заззяў медаль «За баявыя заслугі». Усё гэта было, было…

А сённяшні дзень Віктара Іванавіча Сухадолава – мірны і радасны. Працуе ён вадзіцелем аўтамашыны ГАЗ-53 у саўгасе «Янова», заняты на розных работах – на падвозцы зерня да сеялак, дастаўляе людзей на работу і з работы. Адным словам, робіць тое, што даручаюць.

Ладзіцца і сямейнае жыццё. Ажаніўся, падрастаюць дзеткі. Цяпер толькі жыць, працаваць ды радавацца. Але іншы раз успамінаецца вайна ў гарах Афганістана, і сэрца сціскае боль. І падумаецца: як добра, што для нашых салдат гэта вайна ўжо скончылася, і маці больш не атрымліваюць «пахаронкі» на сыноў!

**М. Аляксеева**